ПАДЗЕЯ

# Рарытэты — ДОМА!



**Учора прадстаўнікі МУС краіны перадалі ў Нацыянальную бібліятэку 15 рарытэтаў, выкрадзеных злачынцамі з аддзела рэдкіх кніг**

Нагадаем, што 12 рэдкіх кніг былі выкрадзены 23 красавіка гэтага года. Крадзеж фаліянтаў з бібліятэкі здзейснілі чатыры чалавекі, у тым ліку адна дзяўчына. Усе яны зараз знаходзяцца за кратамі.

Як паведаміў падчас цырымоніі перадачы кніг намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік Следчага камітэта МУС краіны Леанід ГЛУХОЎСКІ, гэтае злачынства было добра спланаванае і арганізаванае. Зладзеі выкарысталі падробленыя дакументы, з дапамогай макіяжу і парыкоў мянялі свой знешні выгляд. Адразу ж пасля выкрадання кнігі былі вывезены ў Расію і перададзены калекцыянеру за 16 тысяч долараў ЗША. Гэтыя грошы, дарэчы, злачынцы і не паспелі патраціць — міліцыя іх канфіскавала. Кіраўнік Следчага камітэта паведаміў, што злачынцы паводзілі сябе вельмі асцярожна з пакупніком: свае прозвішчы не называлі, прызначалі сустрэчы не ў самой расійскай сталіцы, а ў Падмаскоўі, прычым толькі пасля папярэдняй дамоўленасці па тэлефоне.

Следчая група правяла велізную работу. Напрыклад, былі прааналізаваныя асобы ўсіх чытачоў бібліятэкі, хто на момант учынення злачынства прыходзіў за кнігамі. Такім чынам удалося вызначыць кола падазраваемых. Паводле слоў Леаніда Глухоўскага, усяго ў «крадзяжы веку» ўдзельнічала не больш чым 6 чалавек. Апроч непасрэдных зладзеяў міліцыя ўстанавіла асобы і тых, хто дапамагаў вывозіць рарытэты за мяжу.

Леанід Глухоўскі адзначыў, што пошук выкрадзеных рарытаў быў сапраўды ўсенароднай справай. Беларускай міліцыі актыўна дапамагалі не толькі расійскія калегі, але і радавыя грамадзяне нашай краіны. Напрыклад, пра тое, што кнігі знаходзяцца ў Маскве, супрацоўнікам Следчага камітэта стала вядома ў пятніцу, у 1 гадзіну ночы. Вядома ж, ляцець у расійскую сталіцу трэба было неадкладна. А ў такі час, як вядома, банкаўскія ўстановы не працуюць. Дзе атрымаць валюту на камандзіровачныя выдаткі? І тут, паводле слоў Леаніда Глухоўскага, прыйшлі на дапамогу нашы суайчыннікі (іх асобы кіраўнік Следчага камітэта не стаў рассакрэчваць), якія выдалі следчым і аператыўнікам грошы на паездку ў Маскву.

У следчых няма сумненняў, што зладзеі кралі кнігі пад заказ. Аднак паводле слоў Леаніда Глухоўскага, прававую ацэнку дзейнасці расійскага калекцыянера павінны даць міліцыя і пракуратура РФ. Магчыма, калекцыянер крадзеных фаліянтаў і не будзе прыцягвацца да крымінальнай адказнасці, паколькі ён аказаў дапамогу ў іх пошуку. Справа ў тым, што на той момант, калі міліцыя выйшла на след калекцыянера, ён ужо паспеў прадаць усе кнігі сваім калегам. Потым давялося калекцыянеру цэлыя суткі разам з беларускімі міліцыянерамі ездзіць па Маскве і выкупляць назад гэтыя кнігі.

Адметна, што падчас раскрыцця гэтага злачынства была выяўлена прапажа яшчэ 4 рэдкіх кніг з Нацыянальнай бібліятэкі. Следства пакуль не паведамляе, хто і якім чынам здзейсніў гэтае злачынства. Вядома толькі, што тры з гэтых чатырох кніг разам з памянёнымі 12 рарытэтамі вернуты ў бібліятэку. Яшчэ адна кніга, якую злачынцы паспелі падарыць, пакуль што знаходзіцца за мяжой, магчыма, нават вывезена з Расіі. Зараз шэраг супрацоўнікаў беларускай міліцыі знаходзяцца ў Маскве і спрабуюць устанавіць дакладнае месцазнаходжанне гэтага рарытэту, каб вярнуць яго на Радзіму.

А вернутыя кнігі яшчэ не хутка стануць даступнымі для чытачоў. Патрэбен час на іх «рэабілітацыю», бо злачынцы, рыхтуючы фаліянты да продажу, пашкодзілі іх. Напрыклад, пасля няўдалых спроб вывесці хімічнымі сродкамі бібліятэчныя штампікі, зладзеі проста вырывалі адпаведныя старонкі.

І яшчэ. Пасля ўчыненых крадзяжоў у Нацыянальнай бібліятэцы, як адзначыў яе дырэктар Раман МАТУЛЬСКІ, уведзены больш строгія правілы захоўвання рэдкіх кніг. Меры гэтыя зусім не лішнія. Нацыянальная бібліятэка нашай краіны без перабольшання з'яўляецца сховішчам велізарных духоўных і матэрыяльных скарбаў. У бібліятэцы захоўваецца каля 8 мільёнаў кніг, з якіх прыкладна 70 тысяч — рэдкія старадаўнія фаліянты. І ўсё гэтае багацце мы павінны зберагчы і перадаць нашчадкам.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**